Вольга Палубінская



# БЕЗ ТЭРМІНУ ДАЎНАСЦІ

Метадыст
Ашмянскай раённай бібліятэкі

Вялікая Айчынная вайна пакінула глыбокі след у гісторыі чалавецтва. Беларусь, якая знаходзілася на перадавой фронту, стала арэнай адной з самых страшных праяў нацысцкага рэжыму. Акупацыя, масавыя расстрэлы і генацыд сталі часткай трагічнай гісторыі беларусаў. Памяць аб тых страшэнных падзеях захоўваецца ў сэрцы нашага народа да сённяшняга дня, перадаецца з пакалення ў пакаленне.

Захавальнікамі інфармацыі аб праявах генацыду ўвесь гэты час застаюцца бібліятэкі. Галоўная мэта іх работы – захаванне памяці аб мільёнах савецкіх грамадзян, якія сталі ахвярамі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Да тэмы генацыду беларускага народа бібліятэкі-філіялы Ашмянскай раённай бібліятэкі пачалі актыўна звяртацца з 2021 г., калі Генеральная пракуратура Рэспублікі Беларусь узбудзіла крымінальную справу па фактах шматлікіх зверстваў нацыстаў у гады Вялікай Айчыннай вайны ў дачыненні да мірнага насельніцтва. Супрацоўнікамі бібліятэк была праведзена вялікая праца па зборы і распаўсюджванні матэрыялаў аб генацыдзе.

Значным пунктам у пачатку гэтай работы стала дэманстрацыя ў жніўні 2022 г. у памяшканні Ашмянскай раённай бібліятэкі выставачнай экспазіцыі «Хто ты, народ рома?..», арганізаванай Рэспубліканскім цэнтрам нацыянальных культур і грамадскім аб'яднаннем «Беларуская цыганская дыяспара» ў межах міжнароднага праекта «Памяць пра генацыд рома на тэрыторыі Беларусі падчас Вялікай Айчыннай вайны». Дагэтуль з матэрыяламі выставы змаглі ўжо пазнаёміцца жыхары многіх гарадоў Беларусі. У адкрыцці экспазіцыі прынялі ўдзел прадстаўнікі выканаўчай улады Ашмянскага раёна, віцэ-старшыня Беларускай цыганскай дыяспары, прадстаўнікі Рэспубліканскага цэнтра нацыянальных культур. На працягу двух тыдняў жыхары Ашмяншчыны знаёміліся з матэрыяламі выставы-экспазіцыі, сярод якіх – успаміны Галіны Аляксандравай, якая цудам выратавалася ад расстрэлу, учыненага фашысцкімі карнікамі каля в. Навасяды Гальшанскага сельсавета Ашмянскага раёна ў лістападзе 1942 г.

У маі 2023 г. Ашмянская раённая бібліятэка стала ініцыятарам правядзення інфармацыйнай сустрэчы «Сохранение исторической памяти о геноциде народов Беларуси», арганізатарамі якой былі Рэспубліканскі цэнтр нацыянальных культур і грамадскае аб'яднанне «Беларуская цыганская дыяспара».

Значную работу Ашмянская раённая бібліятэка правяла па зборы і адшуканні дакументальных матэрыялаў на тэму генацыду. Яе супрацоўнікам давялося шмат папрацаваць у архівах мясцовай газеты «Ашмянскі веснік», краязнаўчага музея імя Ф. Багушэвіча. Неацэнную дапамогу ў пошуку інфармацыі ім аказалі супрацоўнікі Ашмянскай пракуратуры, якія прадаставілі дакументальныя матэрыялы аб праявах генацыду на тэрыторыі Гродзенскай вобласці і непасрэдна ў Ашмянскім раёне. Гэтыя дакументы змяшчаюць звесткі аб масавых расстрэлах, знішчэнні цэлых вёсак і іншых жорсткіх злачынствах, учыненых акупантамі. Вядома, што насельніцтва Ашмяншчыны, як і іншых тэрыторый краіны, моцна адчула на сабе ўсе жахі генацыду. Фашысцкімі карнікамі было знішчана 1875 мірных жыхароў («Ашмянскі веснік», 01.05.1970). Таму асаблівую каштоўнасць уяўляюць сведчанні, што захаваліся дзякуючы намаганням мясцовых жыхароў і архівістаў, якія дапамаглі аднавіць храналогію трагічных падзей.

На аснове сабраных матэрыялаў у 2023 г. у Ашмянскай раённай бібліятэцы была створана выставачная экспазіцыя «Генацыд – наша памяць і боль». Акрамя

дакументальных матэрыялаў на выставе прадстаўлены кніжныя выданні: зборнікі інфармацыйна-аналітычных матэрыялаў і дакументаў «Генацыд беларускага народа» і «Генацыд беларускага народа. Лагеры смерці», выдадзеныя пад рэдакцыяй Генеральнай пракуратуры Рэспублікі Беларусь і якія прадстаўляюць раней невядомыя шырокай грамадскасці звесткі аб лагерах смерці на тэрыторыі БССР у перыяд акупацыі. Гэта не проста кнігі. На кожнай старонцы – мільёны загубленых жыццяў, неймаверная, антычалавечая жорсткасць. Ілюстраваная энцыклапедыя спаленых вёсак Беларусі «Нельга забыць. Нельга апраўдаць. Нельга дараваць» распавядае пра трагедыю беларускіх вёсак, спаленых нацыстамі разам з жыхарамі падчас ліхалецця. Пра знішчаныя фашысцкімі карнікамі вёскі Гродзеншчыны, а іх больш за 300, чытач можа даведацца з кнігі «Сёстры Хатыні. Гродзеншчына». У ліку выданняў, якія экспануюцца, кнігі з серыі «Беларусь. Трагедыя і праўда памяці», што нагадваюць пра трагічныя месцы на карце Беларусі: Азарычы, Дальва, Трасцянец, Хатынь, Урочышча, Пяскі, Чырвоны Бераг. На выставе прадстаўлены і мастацкія творы беларускіх і рускіх пісьменнікаў аб падзеях Вялікай Айчыннай вайны.

Эмацыянальнаму ўспрыманню матэрыялаў садзейнічае афармленне выставы-экспазіцыі: роставая фігура дзяўчыны-вязніцы, фрагменты калючага дроту, колеравая гама афармлення назвы і раздзелаў выставы, дапоўненая прадметамі ваеннага часу.

Прэзентацыя выставы прайшла сімвалічна ў Дзень усенароднай памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны і генацыду беларускага народа. У фае Ашмянскай раённай бібліятэкі сабраліся прадстаўнікі маладога пакалення, старэйшыя жыхары горада. У прэзентацыі выставачнай экспазіцыі прынялі ўдзел намеснік пракурора Ашмянскага раёна Святлана Малец, старшы інспектар сектара культуры Ашмянскага раённага выканаўчага камітэта Валянціна Александровіч, навуковы супрацоўнік краязнаўчага музея імя Ф. Багушэвіча Святлана Чарняк. Прэзентацыя пачалася з глыбокага асэнсавання гістарычнай тэмы, якую вядучыя дадаткова асвятлілі з дапамогай відэароліка «Вёска Ала́. Канвеер смерці» і прэзентацыі кнігі «Генацыд беларускага народа» пад рэдакцыяй Генеральнага пракурора Рэспублікі Беларусь А.І. Шведа.

Мерапрыемства выклікала цікавасць не толькі з боку прысутных, але і атрымала шырокі рэзананс сярод грамадскасці Ашмянскага раёна. Гэта натхніла бібліятэкараў на распрацоўку праекта «Генацыд – памяць і боль беларускай зямлі», які доўжыўся на працягу 2024 г. Асноўнай мэтай праекта было знаёмства з выставачнай экспазіцыяй жыхароў населеных пунктаў, дзе знаходзяцца бібліятэкі-філіялы Ашмянскай раённай бібліятэкі. Бібліятэкары і арганізатары мерапрыемстваў імкнуліся данесці да насельніцтва, асабліва моладзі, важнасць патрыятызму і гістарычнай памяці. Школьнікі і студэнты актыўна ўдзельнічалі ў прэзентацыях, абмеркаваннях і культурных мерапрыемствах, што садзейнічала фарміраванню іх свядомасці і павагі да мінулага свайго народа.

Мерапрыемствы праходзілі з удзелам прадстаўнікоў Ашмянскай пракуратуры, мясцовых органаў улады. Малалетнія вязні дзяліліся сваімі ўспамінамі, іх расказы пра перажытыя жахі пакідалі ў зале глыбокую цішыню і незабыўныя ўражанні. Музычна-тэатралізаваныя кампазіцыі, дэманстрацыя відэаролікаў і фільмаў дапамагалі глыбей зразумець маштабы трагедыі і яе наступствы. Бібліятэкары знаёмілі з літаратурай, прадстаўленай на выставе. Заключныя прэзентацыі адбыліся ў Кальчунскім сельскім савеце. У бібліятэках аг. Кальчуны і в. Будзёнаўка мерапрыемствы прайшлі з удзелам пракурора Ашмянскага раёна Сяргея Кавальчука, намесніка пракурора Святланы Малец, старшыні сельвыканкама Ліліі Янушкевіч, малалетняга вязня Васіля Жаўняка.

З матэрыяламі выставы азнаёміліся і жыхары аддаленых вёсак падчас наведвання бібліёбуса, які напярэдадні Дня Перамогі ператвaрыўся ў франтавы экспрэс.

Праект «Генацыд – памяць і боль беларускай зямлі» стаў важным крокам у захаванні гістарычнай памяці і фарміраванні патрыятычнай свядомасці ў падрастаючага пакалення. Работа ў зададзеным кірунку знаходзіць адлюстраванне і ў далейшай працы Ашмянскай раённай бібліятэкі. У чытальнай зале з’явілася новая выстава-інсталяцыя «Без тэрміну даўнасці: жывая памяць пакаленняў». Створаная база даных «Генацыд на тэрыторыі Ашмяншчыны» папаўняецца новымі звесткамі. Наша задача – не збаўляць тэмпу у абраным напрамку, зрабіць свой унёсак у справу недапушчэння паўтарэння падобных трагедый у будучыні. Без тэрміну даўнасці – гэта не толькі аб правасуддзі, але і аб неабходнасці памятаць, каб не забыцца.

Summary

The article presents the project activities of the Oshmyany regional library dedicated to the 80th anniversary of the liberation of Belarus from the Nazi invaders.